№12 (273)
2010

# Права на волю

Праваабарончы бюлетэнь

## Гэта – бесчалавечна...

FIDH і Праваабарончаму цэнтру "Вясна" стала вядома пра пачатак бестэрміновай галадоўкі зьняволенага Мікалая Аўтуховіча ў сувязі з адмовай у прадастаўленьні яму медыцынскай дапамогі з боку адміністрацыі СІЗА № 1 г. Менску.

У выніку працяглага, больш за год, утрыманьня пад вартай у вельмі неспрыяльных для здароўя ўмовах Мікалай Аўтуховіч страціў практычна ўсе зубы і як сьледства – магчымасьць нармальнага прыёму ежы. Нягледзячы на шматразовыя звароты зьняволенага да адміністрацыі СІЗА і ў Дэпартамент выкананьня пакараньняў МУС Беларусі, яму сістэматычна адмаўляюць у доступе да неабходнай медыцынскай дапамогі. Пры гэтым адміністрацыя СІЗА блакуе перадачу зваротаў Мікалая Аўтуховіча ў Дэпартамент выканання пакараньняў МУС.

Прадпрымальнік Мікалай Аўтуховіч быў асуджаны сёлета 16 траўня Вярхоўным судом Рэспублікі Беларусь на 5 гадоў пазбаўленьня волі па абвінавачаньні ў захоўваньні зброі і боепрыпасаў. Першапачаткова Мікалай Аўтуховіч, а таксама Уладзімір Асіпенка, Міхаіл Казлоў і Аляксандр Ларын абвінавачваліся ў шэрагу цяжкіх злачынстваў, але ў выніку адкрытага разгляду справы ў судзе былі апраўданыя па большасьці прад'яўленых абвінавачаньняў.

Справа мела гучны грамадзкі рэзананс і знаходзілася пад пільнай увагай праваабаронцаў. На думку FIDH і ПЦ "Вясна", сьледства суправаджалася значнымі парушэньнямі працэсуальных гарантыяў, відавочна зьвязаных з палітычнай матывіроўкай.

FIDH і Праваабарончы цэнтр "Вясна" расцэньваюць адмову беларускіх уладаў у прадастаўленьні неабходнай медыцынскай дапамогі вязьню Мікалаю Аўтуховічу як бесчалавечнае, жорсткае абыходжаньне і катаваньні, парушэньне арт. 25 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і арт. 7 Міжнароднага Пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах. FIDH і Праваабарончы цэнтр "Вясна" патрабуюць ад уладаў Беларусі неадкладна спыніць парушэньне правоў зьняволенага Мікалая Аўтуховіча і забясьпечыць яго неабходнай медыцынскай дапамогай.

*Парыж-Менск,*
*18 чэрвеня 2010 г.*

*Праваабарончыя матэрыялы можна таксама прачытаць на сайтах: www.spring96.org; www.charter97.org; www.baj.ru*




Менск, 23 чэрвеня 2010 году.

## "Свабоду інтэрнэту!"

23 чэрвеня ў Менску быў разагнаны АМАПам мірны мітынг супраць ўвядзеньня ў сілу з 1 ліпеня Указу № 60 "Аб мерах па ўдасканаленьні выкарыстаньня нацыянальнага сегменту сеткі Інтэрнэт", які закліканы зрабіць больш жорсткім кантроль беларускіх уладаў за інтэрнэт-прасторай у рэспубліцы.

У 19 гадзінаў 9 чалавек выйшлі на плошчу Свабоды, трымаючы ў руках аркушы фармату А4 з надпісам "Свабоду інтэрнэту". Удзельнікі акцыі былі апранутыя ў майкі з выявай чырвонага перакрэсьленага круга і надпісам унутры "Указ № 60", а таксама з надпісам "Свабоду інтэрнэту". Маладыя людзі прастаялі каля трох хвілінаў, пасьля чаго супрацоўнікі АМАПу, якія падышлі, затрымалі іх, пасадзілі ў аўтазак і павезьлі ва УУС Цэнтральнага раёну.

Удзельнікі акцыі падавалі заяўку на правядзеньне на плошчы Свабоды мітынгу за свабоду інтэрнэту, аднак Менгарвыканкам не санкцыянаваў мерапрыемства.

Затрыманыя правялі ноч у турме.

24 чэрвеня ў судзе Цэнтральнага раёну гораду Менску была разгледжаная справа ўдзельнікаў мітынгу. Яўгену Контушу далі штраф у памеры 25 базавых




велічыняў (875000 беларускіх рублёў), а чатыром удзельнікам па 5 (175000 беларускіх рублёў).

# "Гэта поўная хлусьня"

## Улады Наваполацку хочуць зрабіць з праваабаронцы неанацыста

У Наваполацку міліцыя расьследуе крымінальную справу па факце зьяўленьня ў горадзе нацысцкіх надпісаў. У межах справы яны праводзяць ператрусы ў праваабаронцаў. Тыя скардзяцца ў пракуратуру, але атрымліваюць у адказ дзіўныя лісты. Праваабаронца Зьміцер Салаўёў называе правакацыяй адказ з пракуратуры Наваполацку на сваю скаргу. Адказ падпісаны пракурорам гораду А. Аўсюком.

Зьміцер Салаўёў скардзіўся на дзеяньні супрацоўнікаў міліцыі, якія праводзілі ператрус у памяшканьні, што належыць яму, у межах крымінальнай справы па артыкуле 341 Крымінальнага кодэксу (па факце зьяўленьня ў Наваполацку фашысцкіх надпісаў).

Праваабаронца зьвяртае ўвагу на факты, выкладзеныя ў адказе гарадзкога пракурора, якія не адпавядаюць сапраўднасьці.

"Па гэтай справе дапытаны шэраг асобаў, адзін з іх паказаў, што каля двух гадоў таму пазнаёміўся з хлопцамі, якія прапанавалі стаць сябрам арганізацыі Малады Фронт. Офіс арганізацыі разьмяшчаўся па адрасе Наваполацк, вуліца Алімпійская, 2, – на першым паверсе, зьлева ад уваходу і ўяўляў з сябе пакой, дзе стаяла некалькі сталоў, кампутар, розныя кнігі, сьцягі розных дзяржаваў… Увосень 2009 году, па просьбе хлопцаў, ён намаляваў фашысцкую свастыку на сьцяне офісу на вуліцы…".

Зьміцер Салаўёў заявіў, што з 2003 году, калі ён атрымаў гэты офіс, арганізацыя Малады Фронт там ніколі не знаходзілася: "У нас сапраўды зьбіраецца моладзь, але ніякага Маладога Фронту там не было. На офісе часта бываюць актывісты, тая ж "Моладзь БНФ", і іншыя, хто займаецца культуралагічнай дзейнасьцю".

Праваабаронца мяркуе, што гэта правакацыя: "Гэта поўная хлусьня. Неафашыстаў, якія сапраўды малявалі ў горадзе свастыку, яны не шукаюць. Мне тры разы прыходзілі адмовы, дзе гаварылася, што ў дзеяньнях гэтых людзей няма складу крымінальнага злачынства. І цяпер спрабуюць проста сфабрыкаваць справу з невядомых мне прычынаў. Наогул незразумела, чаму органы пракуратуры і міліцыя ня ловяць гэтых неафашыстаў, а ствараюць праблемы іншым людзям. Яны спрабуюць абмазаць нас брудам і начапіць пэўны ярлык", – падкрэсьліў Зьміцер Салаўёў.

Праваабаронца рыхтуе новую скаргу ў пракуратуру.

## Аднавіць на вучобе Тацьцяну Шапуцьку!

Нямецкая праваабарончая арганізацыя праводзіць новую акцыю ў падтрымку Тацьцяны Шапуцькі, адлічанай па палітычных матывах з БДУ ў сьнежні 2009 году.

Праваабаронцы з арганізацыі Libereco – Partnership for Human Rights надрукавалі паштоўкі ў падтрымку моладзевай актывісткі і прапаноўваюць усім жадаючым накіроўваць іх у Міністэрства адукацыі Беларусі з заклікам аднавіць дзяўчыну на вучобе.

Прэс-сакратар міжнароднай моладзевай арганізацыі Малады Фронт Тацьцяна Шапуцька вучылася на юрыдычным факультэце БДУ па сьпецыяльнасьці "Паліталогія". Прычынай адлічэньня стаў яе ўдзел у Форуме грамадзянскай супольнасьці праграмы "Усходняе партнёрства" у Брусэлі 16-17 лістапада без дазволу дэканата. Пра магчымасьць адлічэньня стала вядома ў першы дзень форуму. 3 сьнежня Тацьцяна была адлічаная з БДУ.

Пытаньне аб выключэньні студэнткі з ВНУ ўздымалася на сустрэчы прадстаўнікоў ЕС з беларускімі ўладамі ў канцы 2009 году. Карл Більдт, кіраўнік МЗС Швецыі, якая на той час старшынствавала ў Еўрасаюзе заявіў: "абсалютна непрымальна", калі адлічэньне з БДУ адбылося з-за ўдзелу Шапуцькі ў Форуме грамадзянскай супольнасьці.

Т. Шапуцька спрабавала аспрэчыць сваё адлічэньне ў судзе, аднак 26 сакавіка суд Маскоўскага раёну Менску не задаволіў яе скаргу.

## У Беларусі з 1990 году вынесены 321 сьмяротны прысуд

**Мінюст перадаў актывісту Руху "За Свабоду" зьвесткі пра колькасьць сьмяротных пакараньняў, вынесеных беларускімі судамі пачынаючы з 1990 году.**

**Паводле інфармацыі Упраўленьня арганізацыі і аналітычнага забесьпячэньня дзейнасьці судовых органаў, пік вынясеньня сьмяротных прысудаў прыпадае на 1997-1998 гады (адпаведна, 46 і 47 сьмяротных прысудаў), потым назіраецца істотнае зьмяншэньне гэтай непрымальнай для еўрапейскіх цывілізаваных краінаў практыкі.**

**Эксьперты тлумачаць рэзкае зьмяншэньне выпадкаў вынясеньня сьмяротных пакараньняў беларускімі судамі ўдасканаленьнем Крымінальнага кодэксу ў 1999 годзе.**

**− Вялікая колькасьць сьмяротных прысудаў у 1995-1998 гадах тлумачыцца разгулам злачыннасьці ў пачатку 90-х. Звычайна толькі праз некаторы час, колькі год, гучныя справы па дзейнасьці буйных крымінальных груповак расьсьледаваліся і даходзілі да суда. Калі ў Крымінальны кодэкс былі ўнесеныя зьмены, і судзьдзі атрымалі магчымасьць караць 25 гадамі ці даваць пажыцьцёвае зьняволеньне, колькасьць вынясеньня сьмяротных прысудаў рэзка паменела, што, безумоўна, даволі пазітыўна. Але я лічу, што Беларусь, каб наблізіцца да стандартаў Рады Еўропы, мусіць цалкам адмовіцца ад сьмяротнага пакараньня. Сусветная гісторыя сьведчыць, што наяўнасьць у краіне сьмяротнага пакараньня не зьмяншае колькасьць цяжкіх крымінальных злачынстваў, − камэнтуе атрыманыя ад Мінюсту лічбы актывіст Руху "За Свабоду", праваабаронца Раман Кісьляк.**

## Рэгістрацыя "Берасьцейскай вясны" прыпыненая

Галоўнае ўпраўленьне юстыцыі Берасьцейскага аблвыканкаму вырашыла прыпыніць рэгістрацыю праваабарончай арганізацыі "Берасьцейская вясна".

Месяц таму рэгістрацыйныя дакументы былі пададзеныя ў адпаведную ўстанову. Старшыня рады праваабарончай арганізацыі Уладзімір Вялічкін кажа, што бачыць у гэтай навіне і добры, і кепскі бок: арганізацыі не адмовілі ў рэгістрацыі, але, разам з тым, і не зарэгістравалі.

Сярод парушэньняў, якія ўпраўленьне юстыцыі адзначыла ў пададзеных дакументах – недакладна пазначаныя грыфы зацьверджаньня на тытульным аркушы. Наступнае парушэньне – адсутнасьць зацьвярджэньня назвы арганізацыі заснавальнікамі. Яшчэ адна недакладнасьць у статуце тычыцца абскарджаньня рашэньняў органаў арганізацыі. Прашыўка статута таксама супярэчыць дзейнаму заканадаўству.

З гэтых пунктаў праваабаронцы пагаджаюцца толькі з трэцім, астатнія выглядаюць недарэчнасьцю, кажа Уладзімір Вялічкін. Праваабаронца выказвае перакананьне, што рашэньне аб прыпыненьні рэгістрацыі – надуманае.

Арганізацыя "Берасьцейская вясна" спрабуе атрымаць рэгістрацыю з 2006 году. Заснавальнікі мяркуюць чарговым разам правесьці ўстаноўчы сход цягам месяцу і зноў падаць дакументы на рэгістрацыю, улічыўшы і выправіўшы пазначаныя "недакладнасьці".

# Вымушаны гуманізм

## Беларусь па колькасьці зьняволеных на 100 тысячаў насельніцтва займае другое месца ў Еўропе пасьля Расіі...

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу ўхваліў законапраект "Аб амністыі ў сувязі з 65-годзьдзем Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гадоў". Па амністыі з папраўчых установаў закрытага тыпу можа быць вызвалена каля 2 230 чалавек, з установаў адкрытага тыпу – каля 900 чалавек, скарочаны тэрмін пакараньня 9 300 асуджаным. Улады штораз прэзентуюць амністыю як акт гуманізму. Але за адваротным бокам медалю хаваецца ня толькі намер даць яшчэ адзін шанец асуджаным.

Беларусь па колькасьці зьняволеных на 100 тысячаў насельніцтва займае другое месца ў Еўропе пасьля Расіі, а ў сьвеце – трэцяе-чацьвёртае. У дэпартаменце выкананьня пакараньняў МУС Беларусі не хаваюць, што цяпер практычна кожны сёмы грамадзянін, які пражывае на тэрыторыі Беларусі, наўпрост або ўскосна зьвязаны з турмой – ці сам адбываў пакараньне, ці сваякі адбываюць. Да слова, сярэдні тэрмін пазбаўленьня волі ў нас таксама адзін з самых высокіх у Еўропе – 6,3 гады. Статыстыка выразна паказвае, што амністыя – гэта яшчэ (ці найперш?) і спосаб крыху зьменшыць перапоўненасьць пенітэнцыярных установаў.

Аднак у адным з інтэрв'ю старшыня камісіі па нацыянальнай бясьпецы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Віктар Гумінскі прызнаўся, што "адны амністыі сітуацыю з вялікай колькасьцю асуджаных у Беларусі не выратуюць, неабходныя зьмены ў заканадаўстве". Па словах Гумінскага, для таго, каб Беларусь пакінула адну з лідзіруючых пазіцыяў сярод краінаў па паказчыку колькасьці асуджаных на 100 тысячаў насельніцтва, трэба зьмяніць пакараньні за эканамічныя злачынствы.

"Маё асабістае меркаваньне – людзі, асуджаныя за эканамічныя злачынствы, не павінны знаходзіцца на ўтрыманьні ў падаткаплацельшчыкаў. У цяперашні час (другая палова 2009 году – рэд.) у Беларусі 37,5 тысячы чалавек адбываюць пакараньне, з якіх 47 працэнтаў – за эканамічныя злачынствы. Калі мы скароцім у будучым колькасьць асуджаных да пакараньня, зьвязанага з пазбаўленьнем волі, то будзем выглядаць больш-менш годна", – лічыць Гумінскі. Адпаведных пажаданьням дэпутата зьменаў у Крымінальным кодэксе пакуль не было. А колькасьць карупцыйных ды іншых крымінальных справаў эканамічнага характару – уражвае.

Да слова, каб паказаць чыноўнікам бязрадасныя перспэктывы "зоны", з ініцыятывы генеральнага пракурора Беларусі ў Менску і іншых рэгіёнах краіны арганізаваныя і праводзяцца экскурсіі ў пенітэнцыярныя ўстановы. Гавораць, што гэтае ноу-хау карыстаецца папулярнасьцю.

Паводле законапраекту, пад вызваленьне ад крымінальнай адказнасьці і пакараньня трапляе шэраг катэгорыяў асуджаных, сярод якіх – непаўналетнія, цяжарныя жанчыны; жанчыны і адзінокія мужчыны, якія маюць непаўналетніх дзяцей; асобы пенсійнага ўзросту; інваліды; хворыя на актыўную форму сухотаў; ВІЧ-інфіцыраваныя; ветэраны баявых дзеяньняў; удзельнікі ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС, а таксама асобы, якія атрымалі раненьні пры выкананьні абавязкаў у перыяд праходжаньня службы.

Амністыя хворых на сухоты і ВІЧ-інфіцыраваных – насамрэч акт гуманізму. І ня толькі для іх, але і для людзей, якія адбываюць пакараньне побач з імі. У Беларусі нармальнай практыкай зьяўляецца, калі хворыя і здаровыя сядзяць у адной перапоўненай камеры. Пра асобныя камеры, асобнае харчаваньне размова не вядзецца. Тым больш што і для звычайных людзей умовы лячэньня часам далёкія ад нармальных. Нагадаю, што ў 2008 годзе хворыя на сухоты двойчы абвяшчалі галадоўкі ў лякарнях краіны на знак пратэсту супраць кепскіх умоваў лячэньня і абразьлівага абыходжаньня з імі медперсаналу.

Былы палітвязень Аляксандр Казулін лічыць, што амністыя – заўсёды акт гуманістычны, але ў нашай краіне мае свае асаблівасьці. "З большага амністыя ў Беларусі камерцыйная. То бок, калі ты заплаціў, то можаш патрапіць пад амністыю. Але зарабіць у турме сабе на амністыю немагчыма – у мае часы заробак зьняволенага быў недзе 25 тысячаў у месяц, ня думаю што зараз ён большы. Вось і атрымліваецца, хто мае грошы, мае і шанцы выйсьці на волю, – разважае палітык. – Магу сказаць, што сорак працэнтаў, а можа і ўсе пяцьдзясят, з тых, хто знаходзіўся ў турме разам са мной, можна было не пазбаўляць волі, а пакараць іншымі санкцыямі. Наогул, усе праблемы, пра якія гавораць у прэсе, маюць месца ў беларускай пенітэнцыярнай сістэме. Але каб нешта зьмянілася, патрэбная галоснасьць, каб людзі ведалі, у якіх умовах знаходзяцца вязьні".

Эксперты і праваабаронцы ўмовы ўтрыманьня ў беларускіх турмах называюць блізкімі да катаваньня. Так, прадстаўнік ААН/ПРААН у Беларусі Антоніюс Брук заявіў, што ў нашай краіне няма ніводнай турмы, якая б цалкам адпавядала стандартам Сусьветнай арганізацыі аховы здароўя па інфекцыйным кантролі. Дыпламат выказваў шкадаваньне і з нагоды таго, што ў беларускіх турмах ніколі не праводзіліся дасьледаваньні па пытаньнях гвалту, у тым ліку сексуальнага.

Да прыкладу, у Расіі дасьледаваньні паказалі, што больш за 40 працэнтаў зьняволеных зьведваюць сексуальны гвалт. Сьпецыялісты ўпэўненыя, што айчынныя "зоны" не зьяўляюцца піянерскім лагерам паводле ўнутраных правілаў жыцьця вязьняў. Але публічна гаварыць пра іх праблемы ўлады не гатовыя, прыкрываючы непрыемныя факты адгаворкамі, што турма – ня зона адпачынку, і мусіць у чалавека, які туды патрапіў, выклікаць адпаведныя пачуцьці.

**Паводле газеты "Новы час".**

## "Новы час" атрымаў папярэджаньне ад... Міністэрства гандлю

**Газета "Новы час" атрымала чарговае папярэджаньне – гэтым разам ад Міністэрства гандлю. "Новы час" зьмясьціў інфармацыю пра перадачы спадарожнікавага каналу Белсат. Міністэрства гандлю палічыла гэта рэкламай. Распавядае галоўны рэдактар "Новага часу" Аляксей Кароль: "Складзены пратакол – я яго ўжо атрымаў, і справа ўжо перададзеная ў суд. Чакаем позву з суда. Гэта адміністрацыйная справа. Мы не пагадзіліся, што гэта рэклама. Гэта інфармацыя, якая зробленая на бязвыплатнай аснове. Канкрэтна ў чым яны нас абвінавачваюць — гэта тое, што рэклама павінна ўтрымліваць нумар ліцэнзіі, адрас рэкламадаўцы, а гэтага ў нас няма. Мы далі тлумачэньні, што гэта не рэклама, а гэта абмен інфармацыяй, і грошы за гэта ніхто не атрымоўваў. Мы праінфармавалі, яны калі-нікалі інфармуюць, пра што піша "Новы час". І вось справу будуць разглядаць цяпер у судзе".**

**Газеце "Новы час" пагражае штраф ад 20 да 50 базавых велічыняў.**

**Літаральна тыдзень таму тыднёвік "Новы час" атрымаў папярэджаньне ад Міністэрства інфармацыі. Газету вінавацяць у тым, што ў выходных дадзеных не пазначаныя імя па бацьку галоўнага рэдактара, штрыхавы ідэнтыфікацыйны код, а таксама не названы рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіраваньня ў сферы масавай інфармацыі.**

**А ў Горадні будуць судзіць грамадзкага распаўсюдніка, у чыёй машыне знайшлі пачак газет "Новы час". У пратаколе міліцыянты запісалі, што гэта "спроба распаўсюду".**

# Ёсьць падставы зьвярнуцца ў суд

Пракуратура Гомельскай вобласьці пакуль не зьбіраецца вяртаць намесьніцы галоўнага рэдактара "Народнай волі" Марыне Коктыш яе кампутары альбо капіяваць для яе якую-кольвек інфармацыю.

Гэта вынікае з ліста, які Марына Коктыш атрымала ад намесьніка пракурора Гомельскай вобласьці Броўкі (В. В. Бровко). Марына прасіла адмяніць рашэньне дазнаўцы УУС Гомельскага аблвыканкаму Аляксандра Пусева, які далучыў яе рэчы да матэрыялаў крымінальнай справы, альбо хаця б даць скапіяваць патрэбныя ёй для працы файлы.

"Падставаў для таго, каб задаволіць Ваш зварот, на дадзены момант не ўгледжваю", – гаворыцца ў пасланьні, датаваным 17 чэрвеня.

У сьледчых зараз знаходзяцца два сістэмныя блокі ад кампутараў Марыны Коктыш і флэшка. Раней, 19 траўня, Марына ўжо прасіла дазнаўцу А. Пусева вярнуць ёй працоўны кампутар альбо скапіяваць з яго некаторыя тэкставыя файлы. 20 траўня ён адхіліў хадайніцтва – па меркаваньні намесьніка пракурора вобласьці, "законна і абгрунтавана".

"Забраныя ў Вас носьбіты інфармацыі прызнаныя рэчавымі доказамі, на сёньня маюць дачыненьне да крымінальнай справы, паколькі з іх дапамогай высьвятляюцца абставіны, якія маюць значэньне для справы…", – гаворыцца ў лісьце. Паводле словаў намесьніка пракурора, іх вернуць тады, "калі орган крымінальнага перасьледу дакладна прызнае, што яны ня здольныя высьвятляць альбо абвяргаць абставіны, што падлягаюць доказваньню".

Увогуле ж, "орган папярэдняга расьсьледаваньня не ўпаўнаважаны паведамляць Вам, якая мае працэсуальны статус сьведкі па справе, пра вынікі расьсьледаваньня", – рэзюмуе намесьнік пракурора.

Намесьнік старшыні ГА "БАЖ", юрыст Андрэй Бастунец мяркуе, што органы крымінальнага перасьледу злоўжываюць сваімі паўнамоцтвамі. "Як прыйсьці з percтрусам, забраць асабістыя рэчы ці выклікаць на допыт – тут чамусьці сьледзтва ня ўзгадвае, што мае справу са сьведкамі, а не з падазраванымі. А як даходзіць да таго, каб праінфармаваць, што адбываецца, – тут пракуратура раптам пра гэта "ўзгадвае". Атрымліваецца, што людзей дапытваюць фактычна ў якасьці падазраваных, але яны ня маюць тых правоў, якія маюць падазраваныя. Забіраюць у іх рэчы – а яны нават ня могуць даведацца, на якой падставе гэта адбылося і якія будуць наступствы. Лічу, што органы крымінальнага перасьледу злоўжываюць сваімі паўнамоцтвамі і парушаюць прынцыпы Крымінальна-працэсуальнага заканадаўства, якое ставіць абарону правоў грамадзянаў на першае месца. У журналістак ёсьць падставы зьвярнуцца ў суд, і ў выпадку неабходнасьці БАЖ ім у гэтым дапаможа".

Нагадаем: крымінальная справа паводле ч. 2 арт. 188 КК РБ была ўзбуджана 31. 12. 2009 старшым дазнаўцам УУС Гомельскага аблвыканкаму Аляксандрам Пусевым па факце зьяўленьня ў Інтэрнэце паклёпу на былога начальніка УКДБ па Гомельскай вобласьці Івана Каржа.

З канца лютага беларускіх журналістак Натальлю Радзіну, Марыну Коктыш, Ірыну Халіп, Сьвятлану Калінкіну пачалі выклікаць на допыты, праводзіць у іх кватэрах і на працоўных месцах percтрусы, забіраць носьбіты інфармацыі. Найбольшую колькасьць кампутараў – 8 – забралі ў рэдакцыі сайту "Хартыі-97".

У красавіку-траўні адбывалася экспертыза забранай у журналістак тэхнікі. Пасьля яе заканчэньня ў канцы траўня Сьвятлане Калінкінай вярнулі ноўтбук і кампутар яе сына (яшчэ адзін ноўтбук і кампутар паранейшаму застаюцца ў сьледзтва). Натальлі Радзінай, Марыне Коктыш і Ірыне Халіп тэхнікі не аддалі, далучыўшы яе да матэрыялаў справы ў якасьці рэчавых доказаў.

**Паводле прэс-службы БАЖ.**

# Атака на сайты. Рэпетыцыя?

Заканадаўчыя акты адносна "ўдасканаленьня" нацыянальнага сегменту сеткі Інтэрнэт у Беларусі пачнуць дзейнічаць з 1 ліпеня, аднак апрабацыя асобных пунктаў прэзідэнцкага ўказу і ўрадавай пастановы ўжо пачалася. Пра гэта гавораць прадстаўнікі інтэрнэт-супольнасьці, якія сутыкнуліся са спробамі паралізаваць іх дзейнасьць звонку. Асаблівa гэта стала заўважна падчас палітычных спрэчак паміж кіраўнікамі Беларусі і Расіі ў гэтак званай "газавай вайне".

Апошнімі днямі кожная раніца для вэб-каманды сайту "Хартыя-97" пачынаецца амаль аднолькава – са спробы высьветліць, чаму гэтым разам "ляжыць" інтэрнэт-рэсурс. Напярэдадні з-за масіраванай DOS-атакі старонка "Хартыі" не загружалася зусім альбо грузілася надзвычай марудна. Хакерская атака здарылася якраз тады, калі на сайце павінна была зьявіцца анансаваная стэнаграма гутаркі патэнцыйнага кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Саньнікава ў студыі радыёстанцыі "Эхо Москвы" і тэлеканалу RTVi. Аналагічныя праблемы былі і 23 чэрвеня.

Падчас высьвятленьня "газавых" адносінаў паміж расейскімі і беларускімі чыноўнікамі чытачам было складана наведваць старонку газеты "Наша ніва". "Трасе" сяды-тады і іншыя сайты дэмакратычнай скіраванасьці. Прэс-служба Маладога Фронту распаўсюдзіла інфармацыю пра атаку на іхныя сайты: "Пакуль беларускае грамадства абмяркоўвае праблемы ўвядзеньня ўказу № 60, улада робіць першыя крокі па абмежаваньні свабоды ў сеціве", – гаворыцца ў заяве. – "Адныміз першых пад уплыў указу (альбо пад сваволства сьпецслужбаў) патрапілі маладафронтаўцы".

Ад пачатку чэрвеня пачаліся праблемы ў працы сайту mfront.net, абнаўленьне старонкі стала практычна немагчымым. Меркаваньні, што гэта тэхнічныя непаладкі на серверы ці праграмныя памылкі ў скрыптах, давялося адкінуць – высьветлілася, што праблемы выкліканы ўмяшаньнем звонку. Пашкоджана база дадзеных і цалкам выдалена адміністрацыйная частка сайту. З разьдзелу апошніх навінаў на mfront.net цалкам зьнік матэрыял "Стоп бензін. Мы ня дойныя каровы". Вось што расказалі ў прэсавай службе арганізацыі: "Сайт Салігорскага Маладога Фронту saligorsk.org. выдалены з-за вірусаў. Што тычыцца сайту mfront.net, то бачна, што нехта звонку ўмяшаўся. Праўда, нейк ня хочацца казаць з упэўненасьцю, што гэта сьпецслужбы ці крывавы рэжым. Але бачна, што нехта звонку сайт пашкодзіў".

У сваім блогу вядомы інтэрнэт-сьпецыяліст Юры Зісер піша, што спроба цэнзураваньня інтэрнэту можа мець для краіны непажаданыя наступствы. Так, у праекце Палажэньня аб парадку абмежаваньня доступу карыстальнікаў інтэрнэт-паслугаў да інфармацыі, якая забароненая да распаўсюду ў адпаведнасьці з заканадаўчымі актамі, прадугледжваецца гэтак званая кантэнт-фільтрацыя. Ці, як часам яе яшчэ называюць, – "кітайскі фаервол". Навошта гэта робіцца – нескладаная задача. Як удакладняе спадар Зісер, аператыўнікам і кампутарным інжынерам так нашмат зручней працаваць – тэхнічна прасьцей аднойчы зафільтраваць тэкст паведамленьня патэнцыйнага "тэрарыста", чым зьмяшчаць у чорны сьпіс усе URL-адрасы, дзе гэтае паведамленьне надрукаванае. Як піша адмыслоўца, "кітайскі фаервол" – гэта чырвоная ануча для любога інвестара: "Такое можа дазволіць сабе Кітай з ягонай эканамічнай магутнасьцю. Аднак наіўна думаць, што "кітайскі фаервол" даруюць Беларусі".

# У ахвяраў катаваньняў ёсьць твары

У апошнія гады жорсткае абыходжаньне і катаваньні сталі звычайнай рэччу ў сучаснай Беларусі.

Міжнародны дзень падтрымкі ахвяраў катаваньняў адзначаецца ва ўсім сьвеце 26 чэрвеня. У Беларусі яму надаецца непараўнальна менш увагі, чым, скажам, Дню ПДВ або Дню памежніка.

Між тым, Беларусь зьяўляецца падпісантам Канвенцыі ААН супраць катаваньняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных ці прыніжаючых годнасьць відаў абыходжаньня і пакараньня. У жніўні 2009 г. Рэспубліка Беларусь прадставіла чацьвёрты перыядычны даклад аб мерах па выкананьні абавязацельстваў. У гэтым дакладзе гаворыцца шмат аб прывядзеньні законаў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасьць з Канвенцыяй, аб паляпшэньні матэрыяльна-побытавых умоваў у месцах пазбаўленьня волі і сьледчых ізалятарах, аб стварэньні ўмоваў утрыманьня, адпаведных міжнародным стандартам, аб прафілактыцы і барацьбе з сухотамі і СНІДам, і іншых дасягненьнях Беларусі ў галіне прадухіленьня катаваньняў.

Аднак выключна пазітыўны зьмест дакладу зьняпраўджваецца рэчаіснасьцю. Толькі невялікая частка зьбіваньняў, зьневажаньняў, запалохваньняў і бесчалавечнага абыходжаньня становіцца вядомай грамадзкасьці, але і гэтага дастаткова, каб зразумець, што катаваньні ў Беларусі сталі нормай жыцьця і часта ўжываюцца як інструмент у працы сілавых структураў.

Пра гэта сьведчаць шматлікія факты. Напрыклад, разгоны мірных дэманстрацыяў, пры якіх дэманстрантаў жорстка зьбіваюць, а пасьля гэтага зьдзекуюцца ў аддзяленьнях міліцыі. Пры гэтым "родная міліцыя" дэманструе выключную вынаходлівасьць і дасканаласьць ў прымяненьні як фізічных, так і псіхалагічных катаваньняў. У гэтым арсенале такія "працэсуальныя дзеяньні", як шматгадзіннае стаяньне затрыманых без руху, адмова ў вадзе і ежы, падстрыганьне валасоў для забавы, пагроза згвалтаваньнем затрыманым абодвух палоў і гэтак далей. А з "традыцыйнымі" зьбіцьцём і абразамі сутыкаецца практычна кожны затрыманы.

Яскравым прыкладам зьяўляюцца і нядаўнія выпадкі выкраданьня грамадзянскіх актывістаў. Маладых людзей хапалі на вуліцы, апраналі мяшок на галаву, зьбівалі, адвозілі ў лес, імітавалі пакараньне... Такога кшталту псіхалагічнае запалохваньне Канвенцыя безумоўна вызначае як катаваньні; вядома, вінаватыя не былі знойдзеныя, нягледзячы на тое, што пацярпелыя бачылі твары выкрадальнікаў і нават апазналі аднаго з іх – супрацоўніка сьпецпадразьдзяленьня "Алмаз" Аляксандра Леаненку, па здымках у СМІ.

Яшчэ адным абуральным прыкладам прымяненьня катаваньняў зьяўляецца адмова ў прадастаўленьні медычнай дапамогі. Так у 2005 годзе да перанеслага інсульт палітвязьня Міхаіла Марыніча на працягу многіх дзён не пускалі ўрача. Трэба сказаць, што гаворка ідзе пра чалавека, які мае ранг надзвычайнага і паўнамоцнага амбасадара, шматгадовы досьвед міністэрскай і дыпламатычнай службы. Страшна ўявіць, што адбываецца са звычайнымі зьняволенымі. Можна з упэўненасьцю сказаць, што такая практыка працягваецца. Так, сёньня адмовай у элементарнай медычнай дапамоге катуюць Мікалая Аўтуховіча.

Такія выпадкі становяцца вядомыя толькі дзякуючы актыўнай пазіцыі грамадзянскай супольнасьці, апазіцыі і СМІ. Але ж з катаваньнямі сутыкаюцца ня толькі палітычныя і грамадзянскія актывісты.

Многіх шакаваў расповед пра зьверствы беларускай міліцыі на допытах, з якімі сутыкнуўся прараб Павел Ляўшын. Маладога чалавека метадамі сярэднявечнай інквізіцыі прымушалі абгаварыць сябе.

Ці Аляксей Аксяневіч, які загінуў ад траўмаў пры загадкавых абставінах пасьля таго, як яго незаконна затрымала міліцыя. Бацькам ужо двойчы адмовілі ва ўзбуджэньні крымінальнай справы. Крымінальная справа не была ўзбуджаная нават па факце ненатуральнай сьмерці.

Няўжо пасьля такіх выпадкаў нехта можа даць заруку за тое, што знаходжаньне ў РУУС, ЦІП, СІЗА і іншых установах такога роду бясьпечнае?

Скажаце, гэта адзінкавыя выпадкі? Выйдзіце на вуліцу і спытайце ў першага сустрэчнага чалавека актыўнага ўзросту, што такое "ластаўка". Многія будуць ведаць не адно значэньне гэтага слова.

Амплітуда катаваньняў у Беларусі вар'іруецца ад умоваў утрыманьня ва ўстановах закрытага тыпу, выкраданьняў, запалохваньняў, сексуальных дамагальніцтваў у дачыненьні да мужчынаў і жанчынаў і заканчваючы нанясеньнем цяжкіх цялесных пашкоджаньняў пры выбіваньні паказаньняў, у тым ліку з сьмяротным вынікам.

Пры гэтым як "праваахоўныя органы", так і пенітэнцыярная сістэма Беларусі характарызуюцца поўнай адсутнасьцю публічнасьці і грамадзянскага кантролю, таму толькі адзінкавыя выпадкі становяцца аб'ектам галоснасьці.

Але і ў гэтых выпадках дамагчыся справядлівасьці не ўяўляецца магчымым нават пры наяўнасьці ўсіх доказаў. Так, рэдактар сайту Charter97.org Натальля Радзіна, зьбітая прыператрусе, нягледзячы на шматлікіх сьведкаў і заключэньне медыцынскай экспертызы, замест паўнавартаснага расьсьледаваньня і пакараньня вінаватага атрымала зьдзеклівыя заўвагі з боку дазнаўцы Аляксандра Пусева. Але ёй, можна сказаць, яшчэ пашанцавала. Прадпрымальнік Сяргей Парсюкевіч за спробу аднавіць справядлівасьць і прыцягнуць да адказнасьці міліцыянта Аляксандра Дулуба, які зьбіваў яго ў ізалятары на вуліцы Акрэсьціна, атрымаў два з паловай гады турмы.

Амаль ніводны з супрацоўнікаў міліцыі або турэмнай адміністрацыі, адказны як за вышэйпералічаныя выпадкі, так і за многія іншыя, не панёс пакараньня. Такія факты дазваляюць казаць аб санкцыянаваньні катаваньняў і бесчалавечнага абыходжаньня ў Беларусі. Ня дзіўна, што ў гэтай сітуацыі супрацоўнікі сілавых структураў, надзеленыя ўладай, адчуваюць поўную беспакаранасьць.

Няма ніякіх сумневаў, што росквіт такіх пачварных праяваў, як катаваньні, стаў магчымым толькі "дзякуючы" сёньняшняму рэжыму. З кожным годам стаўленьне да грамадзянаў з боку сілавых структураў становіцца ўсё больш жорсткім і рэпрэсіўным. Тое, што было яшчэ немагчымым пяць гадоў таму, стала рэальнасьцю. І страшна ўявіць, да чаго мы прыйдзем яшчэ праз пяць гадоў, калі самі не пакладзем канец гэтаму беззаконьню.

**Паводле salidarnasc.org.**



Алег СУРГАН з Віцебску зьбіты міліцыянтамі.

# У падтрымку Яўгена Якавенкі

15 чэрвеня ў Менску адбыўся "круглы стол" па тэме: "Абарона беларускай мовы ў Беларусі: Яўген Якавенка". Яго правядзеньне было ініцыявана БХД. Праваабаронцы, палітыкі і грамадзкія дзеячы ўсебакова абмеркавалі справу прызыўніка з Гомелю Яўгена Якавенкі, якога асудзілі да году гэтак званай "хіміі" за патрабаваньне ад ваенкамату позвы на роднай мове.

Удзельнікі "круглага стала" паставілі свае подпісы пад тэкстам звароту, які будзе накіраваны прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, у Палату прадстаўнікоў РБ і ў Генеральную пракуратуру РБ.

Падчас "круглага стала", праваабаронца Валянцін Стэфановіч паведаміў, што сусьветная праваабарончая арганізацыя "Міжнародная амністыя" рыхтуецца да правядзеньня тэрміновай кампаніі з патрабаваньнем адмяніць прысуд Яўгену Якавенку. Праваабаронца паведаміў пра прысуд Якавенку ў "Міжнародную амністыю", апісаў абставіны справы і даслаў копію прысуду: "Я напісаў, што малады чалавек патрабаваў альтэрнатыўнай службы з-за яго перакананьняў. У адказ мне прыйшло паведамленьне, што "Міжнародная амністыя" зьбіраецца пачаць кампанію тэрміновых паведамленьняў на імя прэзідэнта Беларусі, у Вярхоўны суд і Генеральную пракуратуру з патрабаваньнем адмяніць прысуд Якавенку", – сказаў Стэфановіч.

У Гомелі ўсьлед за Менскам створаны грамадзкі аргкамітэт у абарону Яўгена Якавенкі, пакаранага годам абмежаваньня волі за ўхіленьне ад прызыву ў войска. Як паведаміў каардынатар БХД Кастусь Жукоўскі, у склад аргкамітэту ўвайшлі звыш 20 праваабаронцаў, прадстаўнікоў грамадзкасьці, палітычных партыяў, творчай інтэлігенцы.

Прынята заява, у якой абгрунтавана законнасьць патрабаваньняў Яўгена Якавенкі да ваенкамату – камунікаваць з ім на беларускай мове і забясьпечыць яму гарантаваную Канстытуцыяй магчымасьць праходзіць альтэрнатыўную службу.

Сумесны дакумент аргкамітэт накіраваў ў Канстытуцыйны суд, Адміністрацыю прэзідэнта, Генеральную пракуратуру, Міністэрства юстыцыі і мясцовыя органы ўлады.

Тым часам сам Яўген Якавенка і ягоны адвакат накіравалі касацыйныя скаргі ў абласны суд на адмену выраку.

Нагадаем, што 4 чэрвеня судзьдзя Цэнтральнага раёну Гомелю Тацьцяна Швец пакарала 25-гадовага актывіста БХД Якавенку годам "хіміі". Сутнасьць канфлікту прызыўніка і гарадзкога ваенкамату даволі простая: прызыўнік патрабаваў, каб позвы яму выпісвалі на роднай беларускай мове. На расейскай ня браў прынцыпова, паколькі прызывалі яго ў беларускае войска. Жорсткае пакараньне Якавенкі, як лічаць сябры аргкамітэту, сталася непрыхаванай дыскрымінацыяй паводле моўнай прыкметы.

# Паветраныя балонікі – не перыядычныя выданьні

29 чэрвеня ў аршанскім гарадзкім судзе разглядалася справа Руслана Канавалава, якога вінавацяць ў незаконным распаўсюдзе друкаваных выданьняў. Судзьдзя Тацьцяна Герасімовіч спыніла справу, ініцыяваную супраць моладзевага актывіста супрацоўнікамі аршанскай транспартнай міліцыі, праз адсутнасьць доказаў.

Нагодай для судовага разгляду сталіся падзеі 30 красавіка. Супрацоўнікі транспартнай міліцыі затрымалі Руслана Канавалава на аршанскім вакзале ды канфіскавалі ў яго 1700 балонікаў з лагатыпам кампаніі "Гавары праўду", а таксама каля тысячы ўлётак з партрэтам паэта Уладзіміра Някляева, лідэра гэтай грамадзкай кампаніі. Пазьней, 11 траўня, на моладзевага актывіста склалі пратакол паводле адміністрацыйнага артыкулу 22.9 – за незаконны распаўсюд перыядычных друкаваных выданьняў. Хаця Руслан Канавалаў толькі прывёз з Менску ўсе гэтыя агітацыйныя матэрыялы на просьбу яшчэ аднаго мясцовага актывіста, Алеся Шутава, і фактаў распаўсюду не было.

30 чэрвеня у Чыгуначным райсудзе Віцебску разглядаліся справы Лідзіі Сагідулінай і Галіны Багданавай паводле складзеных 30 красавіка пратаколаў за незаконны распаўсюд друкаваных выданьняў.



Лідзія САГІДУЛІНА.

У суд зьявілася толькі Лідзія Сагідуліна. Яе сяброўка Галіна Багданава знаходзіцца ў санаторыі за межамі краіны. Паводле словаў спадарыні Лідзіі, 30 красавіка, у дзень складаньня пратаколу, іх абедзьвюх затрымалі міліцыянты недалёка ад чыгуначнага вакзалу. Спадарыні вярталіся з Менску. Міліцэйскі патруль, як паказаў сьведка Ягор Баброўскі, у тую раніцу праводзіў рэйд па барацьбе з незаконным транспартаваньнем алкаголю. Чаму пад увагу трапілі дзьве жанчыны з невялікімі пластыкавымі пакетамі, міліцыянт не патлумачыў. Але як толькі ў пакетах былі заўважаныя балонікі з лагатыпам кампаніі "Гавары праўду" і буклеты з партрэтам Уладзіміра Някляева, гаспадыню рэчаў Галіну Багданаву і яе спадарожніцу Лідзію Сагідуліну адразу ж даставілі ў Чыгуначны РАУС. Там і быў складзены пратакол паводле артыкулу 22.9 – за незаконны распаўсюд друкаванай прадукцыі.

Судзьдзя Уладзіслаў Шыкароў спыніў справы супраць актывістак, нават ня выслухаўшы меркаваньняў Лідзіі Сагідулінай пра тое, што ні буклеты, ні тым больш паветраныя балонікі перыядычнымі друкаванымі выданьнямі не зьяўляюцца. У выніку суд спыніў справу Лідзіі Сагідулінай з прычыны недаказанасьці, а справу Галіны Багданавай – праз адсутнасьць складу правапарушэньня.

## На скаргу адказаў той, на каго скардзіліся...

**Сябра ГА "БАЖ" з Гомелю Юры Варонежцаў даслаў паўторную скаргу Генеральнаму пракурору Рэспублікі Беларусь Рыгору Васілевічу. Першую скаргу ён накіраваў у пракуратуру яшчэ 20 траўня – праз два дні пасьля правядзеньня ў яго кватэрыператрусу з "неправамерным адабраньнем маёмасьці". Варонежцаў скардзіўся на дзеяньні супрацоўнікаў Ленінскага РУУС г. Менску, з санкцыі якіх адбыўся вобшук. (Ператрус праводзілі супрацоўнікі УУС Гомельскага аблвыканкаму паводле пастановы старшай сьледчай сьледчага аддзелу Ленінскага РУУС Менску Вікторыі Юхневіч).**

**"Адказ мне прыйшоў не з Генеральнай пракуратуры, а з Ленінскага РУУС Менску. То бок з установы, на якую скардзіўся, – распавёў Юры Варонежцаў. – Мне паведамілі, што мае "скаргі ў пракуратуру і міліцыю разгледжаны і далучаны да матэрыялаў крымінальнай справы…"**

**Згодна з артыкулам 9 Закону Рэспублікі Беларусь "Аб зваротах грамадзянаў", забаронена перадаваць скаргі грамадзянаў у дзяржаўныя органы, іншыя арганізацыі (адказным асобам), дзеяньні альбо бязьдзеяньне якіх абскарджваюцца. За выключэньнем выпадкаў, калі разгляд належыць да выключнай кампетэнцыі гэтых дзяржаўных органаў, іншых арганізацыяў альбо адказных асобаў.**

**"Мне і маёй сям'і, маім дзецям – непаўнагадовай дачцэ і сыну-інваліду з дзяцінства – нанесеная істотная шкода. Забралі іх рэчы: тэлефоны, кампутары, музычныя дыскі, відэакасеты хатніх дзіцячых сьвятаў. Забралі з кватэры і ўсе грошы", – нагадаў Ю. Варонежцаў.**

**Юры Варонежцаў просіць правесьці пракурорскую праверку і даць прававую ацэнку дзеяньням супрацоўнікаў Ленінскага РУУС Менску.**

# Жывы ланцуг: "Мы памятаем!"



Віцебск, 16 чэрвеня 2010 году.

16 чэрвеня ў Менску і Віцебску прайшлі акцыі з патрабаваньнем спыніць рэпрэсіі супраць апазіцыі. Каля станцыі метро "Аўтазаводзкая" актывісты грамадзянскай кампаніі "Еўрапейская Беларусь" правялі пікет у памяць пра зьніклых палітыкаў і грамадзкіх дзеячаў. Яны разгарнулі транспарант з надпісам "Мы памятаем" і сталі ў жывы ланцуг з партрэтамі Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага і Дзьмітрыя Завадзкага.

У цэнтры гораду, уздоўж прасьпектаў Пераможцаў, Незалежнасьці і Машэрава, а таксама на набярэжнай ракі Сьвіслач актывісты грамадзянскай кампаніі "Еўрапейская Беларусь" разьмясьцілі таблічкі з партрэтамі палітвязьня Мікалая Аўтуховіча і лічбай "16". У парках Горкага і Янкі Купалы маладыя людзі раздавалі ўлёткі з інфармацыяй пра палітвязьняў.

У Віцебску акцыя салідарнасьці з Мікалаем Аўтуховічам і Уладзімірам Асіпенкам прайшла на мосце Блохіна. Актывісты "Еўрапейскай Беларусі" трымалі ў руках партрэты палітвязьняў і раздавалі мінакам лістоўкі з інфармацыяй пра іх. А таксама на вуліцах гораду зьявіліся плакаты з партрэтамі Аўтуховіча і лозунгам "Свабоду палітвязьням".

Не абышлося без затрыманьняў. Актывістаў "Еўрапейскай Беларусі" Максіма Вінярскага і Андрэя Ільюшына затрымалі на прасьпекце Незалежнасьці. Каля гадзіны яны правялі ў аўтазаку, пасьля чаго маладых людзей вызвалілі без тлумачэньня прычынаў затрыманьня.

У Віцебску Ірына Пятрова і Канстанцін Іваноў былі затрыманыя супрацоўнікамі міліцыі ў раёне плошчы Перамогі за распаўсюд інфармацыйных матэрыялаў пра палітвязьняў. Іх даставілі ў РУУС Першамайскага раёну і склалі пратаколы па артыкуле 21.14, ч. 2. Пратакол складзены старэйшым інсьпектарам Я. Хадзьковым.

# З-за безвыходнасьці сітуацыі

## Андрэй Бандарэнка абвясьціў галадоўку

Аб'яднаная грамадзянская партыя атрымала ліст ад Андрэя Бандарэнкі, асуджанага на сем гадоў пазбаўленьня волі, які адбывае пакараньне ў папраўчай калоніі №2.

У сваім звароце былы прадпрымальнік і кандыдат у дэпутаты, сябра Нацыянальнага камітэту АГП Бандарэнка піша, што, "ня маючы больш іншых магчымасьцяў і вычарпаўшы ўсе аргументы, бачачы безвыходнасьць сітуацыі, якая перарастае ў адкрытыя рэпрэсіі", ён прыняў рашэньне абвясьціць галадоўку з 8.00 15 чэрвеня 2010 году.

"Пачынаючы з верасьня 2008 году пасьля ўдзелу ў выбарчай кампаніі па выбарах у Палату прадстаўнікоў нацыянальнага сходу РБ я зьведаў цынічны перасьлед з боку сілавых і фіскальных структураў Беларусі, які выліўся ў маё турэмнае зьняволеньне, – піша Андрэй Бандарэнка. – Усе спробы даказаць сваю невінаватасьць і абсурднасьць абвінавачаньня ў судах Менску ні да чаго не прывялі.

Судовая сістэма, якая ідзе на повадзе ў Пракуратуры, абараняе выключна меркантыльныя інтарэсы прадстаўнікоў улады і не ў стане абараняць сваіх грамадзянаў. Такая сістэма ператварылася ў карны орган, які ня мае нічога агульнага з правасудзьдзем. На асабістым прыкладзе я адчуў, што дамагчыся ў Беларусі справядлівага суда немагчыма. Беларускія суды адкрыта парушаюць канстытуцыйныя правы грамадзянаў, ігнаруюць дзейснае заканадаўства Беларусі, цалкам парушаюць міжнародныя прынцыпы прэзумпцыі невінаватасьці, правы на абарону і свабоду грамадзянаў Беларусі.

З-за падобнага "справядлівага суда" я пазбаўлены свабоды за свае палітычныя погляды, а мая сям'я (бацька-пенсіянер, жонка ў дэкрэтным адпачынку і двухгадовая дачка Маша) апынуліся бяз сродкаў да існаваньня.

Апынуўшыся ў такіх умовах, я ня маю намеру мірыцца з абуральнымі фактамі ганеньня і ўшчамленьня маіх правоў і свабодаў. Я патрабую:

1. Безумоўнай адмены антызаконнага і неабгрунтаванага прысуду.
2. Поўнага спыненьня крымінальнага перасьледу.
3. Сустрэчы з прадстаўнікамі АГП і незалежных СМІ.
4. Сустрэчы з прадстаўнікамі міжнародных праваабарончых арганізацыяў".

Аб'яднаная грамадзянская партыя зьвяртаецца да ўсіх сваіх прыхільнікаў і неабыякавых людзей з просьбай выказаць падтрымку Андрэю Бандарэнку, напісаўшы ліст на адрас: ***213800, Магілёўская вобласьць, г. Бабруйск, ВЧ-2, атр. 11***, а таксама выказаць сваё меркаваньне пра тое, што адбываецца, начальніку калоніі А. А. Какуніну: ***213800, Магілёўская вобласьць, г. Бабруйск, ВЧ-2.***

# Чыноўнікі "круглы стол" праігнаравалі

**15 чэрвеня арганізатары грамадзянскай кампаніі "Стоп-бензін" спрабавалі зладзіць круглы стол з прадстаўнікамі канцэрну "Белнафтахім", аднак ніхто з чыноўнікаў на сустрэчу не зьявіўся. У круглым стале ўдзельнічалі арганізатары акцыі "Стоп-бензін", журналісты, а таксама незалежны эканаміст Сяргей Чалы ды кіраўнік Асацыяцыі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва Сяргей Балыкін.**

**"Мы хацелі сабраць шырокі круглы стол, з прадстаўніцтвам дзяржаўных органаў, накіроўвалі запрашэньні ў канцэрн "Белнафтахім", Міністэрства транспарту і камунікацыяў, Міністэрства эканомікі, Дзяржаўны мытны камітэт, Міністэрства прамысловасьці. 15 чэрвеня ад іх атрымалі разнастайныя адмовы: ад каго пісьмовыя, ад каго вусныя", – паведаміў Арцём Шаркоў, адзін з арганізатараў акцыі пратэсту "Стоп-бензін".**

**Арганізатары кампаніі "Стоп-бензін" хочуць пачуць ад чыноўнікаў уцямнае тлумачэньне наконт таго, чаму павышаюцца цэны на бензін. Падчас гутаркі ўдзельнікі вылучалі свае гіпотэзы наконт сапраўдных прычынаў падаражэньня паліва, падкрэсьліваючы, што хацелі б пачуць адказы прадстаўнікоў "Белнафтахіму" ці Міністэрства эканомікі.**

**Арганізатары акцыі плануюць працягваць распаўсюджваць налепкі з сімволікай грамадзкай кампаніі "Стоп-бензін", а таксама не адмаўляюць магчымасьці паўтарэньня акцыяў на запраўках.**

# Прытрымліваца "рамак" ня буду...

## Заява прафесара Алега Манаева

1 чэрвеня 2010 году кіраўніцтва Беларускага дзяржаўнага універсітэту, у якім я працую (уключаючы гады вучобы) 40 гадоў, праз дэкана факультэту філасофіі і сацыяльных навук, дзе я працую прафесарам апошнія 18 гадоў, запатрабавала ад мяне напісаць заяву аб звальненьні "па згодзе бакоў" без тлумачэньня якіх-небудзь прычынаў. Я адмовіўся гэта зрабіць, паколькі ніякіх парушэньняў працоўнага заканадаўства альбо акадэмічнай дысцыпліны не дапускаў, і заўвагаў ня маю. Да таго ж да выхаду на пенсію мне засталося ўсяго паўтара года. На наступны дзень мне было сказана, што "я павінен вырашыць гэтую праблему на працягу 10 дзён". Даведаўшыся пра гэта, мае замежныя калегі ініцыявалі збор подпісаў пад лістом-пратэстам, які накіравалі кіраўніцтву БДУ і адміністрацыі прэзідэнта.

18 чэрвеня, нарэшце, адбылася прамая размова з рэктарам акадэмікам Сяргеем Абламейкам і прарэктарам Уладзімірам Клюнем. Мне было сказана, што "ніякіх прэтэнзіяў па выкладчыцкай або навуковадасьледчай працы" да мяне няма. Праблема ў іншым. Як супрацоўнік дзяржаўнага універсітэту я "абавязаны не рабіць дзеяньняў, якія выходзяць за рамкі дзяржаўнай палітыкі". У якасьці такіх дзеяньняў расцэньваюцца мае кантакты з рознымі структурамі і лідэрамі апазіцыі, якія "праводзяць антыдзяржаўную палітыку". Я спрабаваў растлумачыць, што, як прафесійны сацыёлаг, які вывучае беларускае грамадзтва, сустракаюся і абмяркоўваю самыя розныя праблемы з самымі рознымі людзьмі, якія прадстаўляюць як улады, так і апазіцыю. Калі кагосьці цікавіць маё меркаваньне, я выказваю яго незалежна ад палітычных поглядаў сваіх суразмоўцаў. У гэтым – сутнасьць маёй прафесіі, і ў Беларусі, і ў любой іншай краіне. Так, падчас маёй працы ў НІСЭПД, я апублікаваў некалькі кнігаў, дзясяткі навуковых артыкулаў і інтэрв'ю ў СМІ па найважнейшых праблемах разьвіцьця беларускага грамадзтва, у тым ліку такія, якія ўтрымлівалі крытычны аналіз дзеяньняў як уладаў, так і апазіцыі. Існуюць незьлічоная прыклады іх выкарыстаньня рознымі палітычнымі сіламі. Адзін з апошніх – згадка дасьледаваньняў НІСЭПД ў красавіцкім Пасланьні прэзідэнта беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу.

Аднак гэтыя аргументы не пераканалі кіраўнікоў БДУ. Мне сказалі, што "пытаньне аб звальненьні зараз не стаіць", але я "павінен прытрымлівацца вызначаных рамак". Гэта значыць, што далейшая праца ў БДУ аказваецца ў залежнасьці ад маёй палітычнай лаяльнасьці, прычым гаворка ідзе ня столькі пра працу ва ўніверсітэце, колькі за яго межамі. Я высока цаню сваю alma mater і стараюся, каб новыя пакаленьні студэнтаў адчувалі да яе такія ж пачуцьці. Але прытрымлівацца якіх-небудзь ідэалагічных альбо палітычных "рамак" у сваёй прафесійнай дзейнасьці, нават дзеля захаваньня працы, ня буду – гэта супярэчыць майму прафесійнаму і грамадзянскаму абавязку.

Выказваю таксама самую шчырую ўдзячнасьць замежным калегам за разуменьне і падтрымку маёй дзейнасьці. Няма ніякіх сумневаў, што менавіта іх салідарны голас калі не спыніў, дык хаця б замарудзіў працэс майго звальненьня "па згодзе бакоў".

*Менск, 20 чэрвеня 2010 г.*

# "Такім чынам нас не запалохаць"

Многія актывісты моладзевага дэмакратычнага руху адчуваюць пільную цікавасьць да сябе з боку сьпецслужбаў. Маладым людзям прапаноўваюць супрацоўніцтва, запалохваюць іх адлічэньнем з вучобы. Актывісты лічаць, што напярэдадні прэзідэнцкай выбарчай кампаніі ціск узмацніцца.

Кіраўніка мазырскай філіі Маладога Фронту Сяргея Амельчука супрацоўнік КДБ наведаў на вучобе. Сяргей вучыцца ў мазырскім ПТВ № 228. Ён распавёў, што супрацоўнік КДБ, які назваўся Васіліем, чакаў яго ў кабінеце дырэктара: "Калі паклікалі да дырэктара, там ужо быў кадэбэшнік. Спачатку ён мяне спытаў, як я стаўлюся да фашызму. Справа ў тым, што ў нас перыядычна фашысты зьбіваюць іншаземцаў. А днямі адбылася вялікая бойка. Але гэта была толькі нагода. Ён адразу пачаў мяне распытваць пра Малады Фронт: кім я зьяўляюся, колькі нас чалавек у суполцы і г. д. Мы шмат гаварылі пра камунізм і фашызм. Я іх прыраўняў, а ён тады сказаў, што мяне ўсё роўна не пераканаць. Прасіў даваць яму надалей інфармацыю, але я адмовіўся".

Сяргей Амяльчук – не адзіны, каго на вучобе наведаў супрацоўнік КДБ. Каля дзясятка актывістаў "Маладой Беларусі" нядаўна адчулі на сабе ціск сьпецслужбаў.

"Пачалі ціснуць альбо праз бацькоў, прыходзячы на месца працы, альбо прыходзяць на месца вучобы самых актывістаў, – распавёў Артур Фінькевіч. Бацькам кажуць, што іх дзеці патрапілі ледзь ня ў секту, што іх дзеці ў арганізацыі, якая займаецца супрацьпраўнай дзейнасьцю. Пагражаюць крымінальнымі артыкуламі. Бацькам пагражаюць звальненьнем.

На вучобе на актывістаў ціснуць праз дэканат ці настаўнікаў. Такая сітуацыя ў Насты Машчавай, Ільлі Шчарбінскага, Андрэя Кузьмінскага, Улада Шведа, Міхася Наскова, Андрэя Гайдукевіча. Ёсьць і іншыя выпадкі.

"Традыцыйна перад сур'ёзнымі палітычнымі кампаніямі кшталту прэзідэнцкіх выбараў узмацняецца цікавасьць сьпецслужбаў да актывістаў моладзевых арганізацыяў," – кажа Яўген Афнагель, лідэр кампаніі "Еўрапейская Беларусь". Але маладыя людзі, якія прыходзяць у такія арганізацыі, добра ўсьведамляюць, на што яны ідуць, і таму такім шляхам іх запалохаць немагчыма, бо яны праз гэта ўжо прайшлі".

# Працоўны кантракт не працягваюць

**Грамадзкі актывіст з Баранавічаў Рыгор Грык ўжо ў трэці раз за апошнія два гады атрымаў папярэджаньне аб непрацягненьні з ім працоўнага кантракту. Паводле словаў Р. Грыка, у дакуменце, які ён атрымаў 14 чэрвеня ў аддзеле кадраў Баранавіцкага вагоннага дэпо, указана, што кантракт з ім 22 ліпеня 2010 году працягнуты ня будзе.**

**Першы раз грамадзкі актывіст быў звольнены з Баранавіцкага бавоўнянага камбінату пасьля 17 гадоў сумленнай працы за тое, што прымаў удзел у выбарах у Палату прадстаўнікоў у якасьці апазіцыйнага кандыдата ў 2008 годзе.**

**У вагонным дэпо – на апошнім месцы працы – яму таксама не даравалі прынцыповай грамадзянскай пазіцыі. Ён, сябра "Руху "За свабоду", прымаў актыўны ўдзел у сёлетніх выбарах у Баранавіцкі гарадзкі Савет дэпутатаў.**

**Атрымаўшы папярэджаньне, Рыгор Грык хадзіў на прыём да начальніка вагоннага дэпо Мікалая Хвалея. Ён прасіў пакінуць яго на працы, на што начальнік дэпо адказаў, што ён ня супраць. Аднак прысутны на гэтай размове начальнік аддзелу кадраў Генадзь Ніканюк паведаміў, што на прадпрыемстве няма вакансіяў. У выніку Мікалай Хвалей паабяцаў, што на працягу месяца пастараецца знайсьці якую-небудзь працу для Р. Грыка.**



"Права на волю". Праваабарончы бюлетэнь. Выходзіць два разы на месяц на беларускай і рускай мовах.
Наклад 299 асобнікаў. Пры передруку спасылка на бюлетэнь абавязковая.